*Аддзел адукацыі Іўеўскага райвыканкама*

*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*

*“Трабская сярэдняя школа Іўеўскага раёна”*

# Каталіцкі касцёл у Трабах на пераломных этапах гісторыі

**вучэбна - даследчы праект**

**намінацыя** *"Маўклівыя сведкі гісторыі"*



**Аўтар : Сцефаноўская Яна, вучаніца 11 класа Трабскай СШ**

**Кіраўнік: Махнач Рамуальда Станіславаўна, класны кіраўнік 11 класа**

***Змест:***

| | |
|---|---|
| Уводзіны | 3 |
| Этапы станаўлення каталіцкага касцёла ў Трабах ў кантэксце гісторыі дзяржавы і вёскі ў прыватнасці | 5 |
| Касцёл Раства Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Трабах, як культурна-гістарычны помнік | 16 |
| Заключэнне: | 19 |
| Літаратура | 20 |
| Дадатак | 21 |

***Уводзіны***

У кожнага чалавека ёсць на зямлі куточак, які яму асабліва дарагі. Для мяне – гэта вёска Трабы. Яна ўтульна і лагодна размясцілася на ўзбярэжжы ракі Клява. І з якога б боку не пад'язджаў падарожнік да Траб, здалёк, нібы свечкі, зіхацяць, пераліваюцца над зялёнымі шатамі дрэў вежы велічнага касцёла. З малых гадоў маці за руку прыводзіла мяне ў Храм. У гэтым касцёле вянчаліся мае дзядуля і бабуля, мае бацькі. Тут была ахрышчана і я сама. Мне заўсёды было цікава пазнаёміцца з гісторыяй касцёла. Пытанняў было шмат:

- калі з'явіўся касцёл у Трабах і чаму ўзнікла неабходнасць у яго пабудаванні?
- хто будаваў храм і з якога матэрыялу?
- якія архітэктурныя асаблівасці храма, яго стыль і кампазіцыя?
- якая гістарычная і мастацкая каштоўнасць унутранага ўбранства касцёла?
- ці заўсёды касцёл працаваў ?
- якія святары працавалі ў Трабах?
- якія падзеі аказвалі ўплыў на развіццё Трабскага каталіцкага касцёла?

Вызначылася **тэма даследчай работы**: *"Каталіцкі касцёл у Трабах на пераломных этапах гісторыі"*.

Тэма работы выбрана мною не выпадкова. Лічу, што сёння, калі так актуальна праблема духоўнага адраджэння, вельмі важна азірнуцца ў мінулае, навучыцца ўспрымаць гісторыю сваёй радзімы, яе сацыяльных інстытутаў, не толькі як сукупнасць фактаў, але і адчуць яе сваім сэрцам, паспрабаваць унесці свой, няхай і нязначны, уклад у яе захаванне.

Без мінулага няма будучага. А для адраджэння духоўнасці падлеткаў і моладзі неабходна, каб мы ведалі гісторыю свайго народа. Павага да помнікаў даўніны, беражныя адносіны да веры сваіх продкаў дазваляюць нам адчуваць сябе наследнікамі мінулага і асэнсоўваць сваю адказнасць перад будучымі пакаленнямі.

Лічу, што дадзеная даследчая работа **актуальная**, так як у ёй разглядаецца тэма вывучэння нашых духоўных каранёў. Мы вывучаем на ўроках гісторыі асаблівасці храмавага дойлідства, але ў кожнага касцёла ёсць яшчэ і свая асабістая гісторыя, свае асаблівасці. Многіх звестак няма ў архіўных дакументах і фондах бібліятэк. Іх захоўвае толькі народная памяць.

Асноўная **праблема** з якой я сутыкнулася – гэта *адсутнасць абагуленай інфармацыі аб гісторыі станаўлення каталіцкага касцёла ў Трабах.* Розныя энцыклапедычныя даведнікі не давалі адказы на мае пытанні, а прапаноўвалі толькі скупую статыстычную інфармацыю.

**Гіпотэза:** *даследуючы гістарычныя падзеі і палітыку дзяржавы на пераломных этапах гісторыі я змагу вызначыць, якія фактары паўплывалі як на станаўленне каталіцкага касцёлу ў Трабах, яго росквіт, так і на яго заняпад і наступнае адраджэнне.*

***Мэта работы:***

*даследаваць гісторыю каталіцкага касцёла ў Трабах і ўнесці асабісты ўклад у яе захаванне.*

**Аб'ект:** *каталіцкі касцёл у Трабах*

**Прадмет:** *хроніка гістарычных падзей, звязаных з каталіцкім касцёлам у Трабах ад часу пабудавання першага храма ў вёсцы да цяперашняга часу.*

**Задачы:**

1. *вызначыць этапы станаўлення каталіцкага касцёла ў Трабах ў кантэксце гісторыі дзяржавы і вёскі ў прыватнасці;*
2. *апісаць храм як культурна-гістарычны помнік;*
3. *вызначыць ролю касцёла ў фарміраванні духоўнасці жыхароў і развіцці вёскі;*

**Навізна** даследчай работы заключаецца ў тым, што даследуецца фактычна мала вывучаная тэма.

**Метады даследвання**: пры вывучэнні гісторыі станаўлення каталіцкага касцёла ў Трабах выкарыстоўваліся розныя метады і формы работы:

- *аналіз, сінтэз, параўнанне, абагульгненне інфармацыі атрыманай з энцыклапедычных і гістарычнымі дакументаў, з архіваў касцёла Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі ў Трабах, рэсурсаў Інтэрнэт;*
- *гутарка са святаром Трабскага касцёла айцом Віктарам Субелем;*
- *экскурсія і фотасесія на тэрыторыі касцёла;*
- *апісанне архітэктурнага помніка;*
- *сацыялагічнае апытанне.*

## 1. *Этапы станаўлення каталіцкага касцёла ў Трабах ў кантэксце гісторыі дзяржавы і вёскі ў прыватнасці*

Добра вядома, што слова «касцёл» азначае беларускую і польскую назву каталіцкай Царквы як у яе агульнай ідэі духоўнага паяднання людзей, так і ў форме храма. Але, напэўна, не ўсе задумваліся над тым, чаму гэтая назва адрозніваецца ад назваў хрысціянскай Царквы іншых народаў. Каб зразумець гэта, трэба звярнуцца да этымалогіі слова «касцёл», якое паходзіць ад лацінскага castelium, што азначае «невялікая крэпасць», і да гісторыі нашага краю. Пашырэнне каталіцызму на беларускіх землях адбывалася з XIII ст. і асабліва інтэсіўна з канца XIVст., пасля Крэўскай уніі, але яшчэ да Грунвальдскай бітвы 1410 г. Гэта быў складаны, асабліва ў знешнепалітычных адносінах, перыяд жыцця не толькі беларускай дзяржавы, Вялікага Княства Літоўскага, але і Каралеўства Польскага, што прывяло да іх першага палітычнага саюзу. Перад пагрозай крыжацкай навалы заходнія рубяжы Вялікага Княства апярэзаў ланцуг драўляных і мураваных вялікакняжацкіх замкаў. Паводле Хронік, драўляны замак быў пабудаваны князем Трабусам, які і заснаваў мястэчка Трабы. Замкі мелі магутныя сцены і вежы з байніцамі і

баявымі пляцоўкамі, іх абкружалі валы і равы, праз якія вялі пад'ёмныя масты. Усё манументальнае мураванае дойлідства таго часу мела абарончы характар. Першыя каталіцкія храмы мусілі таксама мець абарончыя прыстасаванні, ператварацца ў маленькія цытадэлі. Таму яны і атрымалі назву – касцёл.[ 11 ]

Сваё даследванне я распачала са складання храналагічнага спісу каталіцкага касцёла ў Трабах. Даследаваляся навуковая і архіўная літаратура. Вялося апытанне мясцовых старажылаў і Трабскага святара. Аднавіць удалося не поўны, але дастаткова вялікі спіс.

**XV-XIXст. – драўляная святыня**

1410 – фундацыя святыні

1534 – фундацыя касцёла нараджэння найсвяцейшай Марыі Панны праз Альбрэхта Гаштольда, ваяводу Віленскага

1653 – парафія налічвае 43 сям'і

1669 – парафія ў дэканаце ашмянскім (сінод Сапегі)

1673 – парафія налічвае 19 сем'яў

1744 – парафія ў дэканаце ашмянскім, да якой належыць 15 населеных пунктаў

1781 – парафія ў дэканаце ашмянскім , налічвае 2237 католікаў

1859-1860 – ксёндз Леанард Дамброўскі

1859-1860 – ксёндз Пётр Маркевіч

1860 – парафія ў дэканаце Вішнеўскім, з філіялам у Ценюкаўшчыне - ксёндз Томаш Юржэвіч

1871-1904 – ксёндз Павел Сухоцкі,

1872 – парафія ў дэканаце Вішнеўскім, налічвае 4350католікаў

1892 – парафія ў дэканаце Вішнеўскім, налічвае 3986 католікаў

**XIX-XX ст. – мураваны будынак касцёла**

1904-1911 - ксёндз Эдвард Дакурна

1905 – пабудаванне мураванага будынку касцёла з фундацыі ксяндза Паўла Сухоцкага

1928 – кансэкрацыя касцёла

1911 – 1912 – ксёндз Аляксандр Астрамовіч

1933—1936 – ксёндз Леанард Чарняк

1937-1938 – ксёндз Тэафіл Прышмонт

1938-1940 – ксёндз Вацлаў Родзька

май 1940 – забойства ксяндза Вацлава Родзька.

1940-1943 – ксёндз Францішак Цыбульскі

вікарыем быў у 1940-1942 г. ксёндз Станіслаў Зубковіч

верасень 1942 – арышт ксяндза Цыбульскага

1942-1943 - ксёндз Раман Масевіч

1943 – (12.09) забойства ксяндза Рамана Масевіча

1943-1944 - ксёндз Пётр Вуйна - Аранскі

1945-1966 – ксёндз Альфонс Радкевіч

1966 – ксёндз быў змушаны выехаць у Польшчу

1967-1971 – спроба закрыцця святыні

1971-1973 – да касцёлу даязджае ксёндз Казлоўскі з Барун

1973-1983 – даязджае ксёндз Уладзіслаў Чарняўскі з Вішнева

1988-1991 - атрымлівае парафію ксёндз Антоній Юсель

1991 – 1995 - ксёндз Ян Гавецкі

Пры касцеле працуе закрыстыян Брат Бернат Беленік (ордэн францішканцаў)

1995 – 2004 - ксёндз Тадэвуш Качан

2004 – ксёндз Віктар Субель

Нават з гэтага спіска бачна, як змянялася сітуацыя ў парафіі на пераломных этапах гісторыі.

У канцы XIV ст., пасля заключэння сынам Альгерда Ягайлам у 1385 г. Крэўскай вуніі з Польшчай і хрышчэння ў 1387 г. насельніцтва Літвы па каталіцкаму абраду, у Вялікім Княстве з'явіліся першыя касцёлы, былі ўзведзены яны і на беларускіх землях. Вялікі князь літоўскі Вітаўт у дзяржаўнай палітыцы таксама прытрымліваўся арыентацыі на каталіцкую царкву. Пры ім у 1413 г. заключана Гарадзельская вунія, адпаведна якой даваліся льготы каталіцкім установам, на дзяржаўныя пасады прызначалі пераважна феадалаў-католікаў. Па выбару Вітаўта і па ўласнай згодзе 47 беларускіх

феадалаў разам з сем'ямі ўвайшлі ў польскія гербавыя брацтвы. Абавязковай умовай гэтай акцыі з'яўлялася прыналежнасць да каталіцкага веравызнання і будаўніцтва храмаў. У выніку да канца XV ст. на тэрыторыі Княства было заснавана каля 50 касцёлаў. [ 10 ]

Гісторыя заўсёды вельмі цікава пераплятала свае шляхі ў Трабах. У час эпохі Крэўскай дынастыйнай уніі 1386 года, калі праваслаўны Вялікі князь Ягайла прымае каталіцтва, ажаніўшыся на польскай каралеве Ядвізе, яго родны



брат Свідрыгайла, застаўшыся ў праваслаўнай веры, падымае паўстанне. Князь Дзмітрый Друцкі-Зубравіцкі па мянушцы Сякіра, які з'яўляецца адным з самых значных персанажаў эпохі Вялікага княства Літоўскага, ідзе на вялікую рызыку і падтрымлівае паўстанне, абараняючы веру бацькоў. Але калі князь Дзмітрый застанецца ў гісторыі рэўнасным абаронцам праваслаўя, то яго знатныя патомкі паступова пяройдуць у каталіцтва. З дзяцей у Дзмітрыя (Міткі) Сякіры была толькі дачка Марына, якая нарадзілася ў канцы 14-га стагоддзя. А таму пасля яго смерці атрымала ў спадчыну ўсе землі бацькі. Разам з іншымі маёнткамі яна ўпамінаецца ў грамаце, у якой князь запісвае права на валоданне дачцэ сваёй Марыне. На жаль, дакумент датаваны не годам ад нараджэння Хрыстова, а 7-м індыкта (годам 15 гадовага цыклічнага календара, які быў вельмі распаўсюджаны ў XV ст.). А таму і гады нараджэння княгіні Марыны Трабскай і год заснавання і фундацыі ёю першага касцёла каталіцкага ў Трабах можа быць недакладным, і пакідае мне яшчэ пытанні да даследвання. [ 11 ]



Альбрэхт Гаштольд

Яго дачка Марына пабралася шлюбам з князем Сямёнам Сямёнавічам Гальшанскім-Трабскім і

валодала Трабамі  сумесна з мужам. Менавіта яна, толькі на лацінскі манер, названая Марыяннай, узгадваецца як заснавальніца і фундатарка касцёла ў Трабах у 1410 годзе. Звестак пра будынак касцёла не захавалася. Узгадвваецца толькі, што касцёл быў пабудаваны ў межах замку. [ 9 ] Рана аўдавеўшы Марына Трабская больш не выходзіла замуж, вяла абасобленае, дабрачыннае жыццё. У эпоху неперарыўных міжусобных войнаў яна захавала і памножыла бацькоўскую спадчыну, стала адной з вядомых асоб свайго часу.  На жаль, у сямейным жыцці княгіню Трабскую праследавалі шматлікія беды. Яе адзіная дачка выйшла замуж за ваяводу трокскага Марціна  Гаштольда   і    ў    хуткім часе    памерла,     нарадзіўшы сына Альбрэхта. Прастарэлая Марына Трабская душы ва ўнуку не чула і па завяшчанні перадала яму ўсе свае ўладанні, у тым ліку і  маёнткі Трабскія.  Яна памерла ў 1496 годзе, пражыўшы амаль 100 год. Трабамі стаў валодаць Альбрэхт Гаштольд, найбуйнейшы магнат свайго часу. Менавіта Альбрэхтам Гаштольдам быў у 1534 годзе пабудаваны новы Трабскі Рымска-каталіцкі касцёл, як сведчаць аб тым старажытныя візітыўныя акты. [ 1 ]  У двары была адкрыта прыватная свецкая школа. Школы ў XVI ст. паўставалі пры каталіцкіх катэдрах і парафіях. Адчыняла іх духавенства, магнаты, шляхта і мяшчане. Каталіцкая школа была адкрыта з мецэнацтва Альбрэхта Гаштольда і ў Трабах. Была яна адзіная на ўвесь Ашмянскі павет. У гэтай школе, апрача духоўных навук і Евангелля,    вывучалі   творы Цыцэрона, Вергілія, Эзопа, Сэнэкі і другіх    класічных    паэтаў    і    пісменнікаў,    а таксама беларускую грамату  і  мову,  якая  была  тады  ва  ўсім нашым  краі ўрадавай мовай. [ 5]

У гістарычных дакументах няма звестак аб тым, як і калі быў знішчаны замак у Трабах, а разам з ім і касцёл. Мяркую, што паколькі ўсе збудаванні былі драўляныя, то яны маглі згарэць у час Швецкай вайны. Дакладна вядома, што ў 1708 годзе шведы захапілі Ліду, Смаргонь, Мінск. З жорсткімі баямі рускія войскі адступалі. Ваколіцы Траб захоўваюць памяць аб тых часах. На паўночным усходзе ад Траб, на палогім спуску правага берага ракі Клявы ёсць курганы, якія так і называюцца «шведскія». Відаць, не выпадкова. Я.Тышкевіч выявіў невядомыя дагэтуль падрабязнасці пра ваенны паход караля Карла XII па

Беларусі, дзе фігуравалі знаёмыя геаграфічныя назвы: Горадня, Нясвіж, Наваградак, Менск, Крэва, Смаргонь, Суботнікі, Трабы, Гальшаны. [ ]

На працягу XVII-XVIII стст. пануючае становішча ў дзяржаве, відавочна, займала каталіцкая царква, якая ўсімі магчымымі сродкамі пашырала і замацоўвала свой уплыў у грамадскім жыцці.

Як вядома, у сапраўдным творы архітэктуры павінны арганічна спалучацца тры асноўныя крытэрыі - карыснасць, трываласць і прыгажосць. На самых ранніх этапах будаўнічай дзейнасці чалавека ўтылітарнае прызначэнне і трываласць збудаванняў значна пераважалі над іх эстэтычнымі характарыстыкамі. Таму ў поўнай ступені нельга лічыць іх творамі архітэктуры. Якасна новы этап развіцця дойлідства ўзнікае з пачаткам грамадскага будаўніцтва, якое ў мастацкім вобразе ўвасабляе ідэалагічную праграму сучаснага яму грамадства.

На той час касцёл з'яўляўся амаль што адзіным захавальнікам традыцый культуры. У будынку касцёла апрача рэлігійных рытуалаў праводзіліся і грамадзянскія, захоўваліся каштоўнасці, вяліся летапісы. У архітэктуры касцёла, акрамя сімвалічнага сакральнага зместу, закладзены ідэі патрыятызму і магутнасці дзяржавы.

А таму ўзнікла неабходнасць пабудавання новага касцёла ў Трабах. У той час староства Трабскае было ва ўладанні Антонія Радзімінскага Францкевіча. І менавіта з яго фундацыі ў 1786 годзе быў пабудаваны новы драўляны касцёл і 17 чэрвеня Апостальскім Епіскапам Дэканам Віленскім і Кавалерам Томашам Зянкевічам кансэкраваны ў імя нараджэння Божай Маці. Касцёл быў узведзены на каменным фундаменце з драўлянага сасновага матэрыялу. Абабіты звонку дошкамі і ўмацаваны бакавымі слупамі. Унутры касцёл змяшчаў 5 алтароў. Галоўны алтар разной работы, выкананы з дрэва,



**Драўляны касцёл у Трабах канец XVIII - XIX стст.**

часткова пазалочаны. У ім размяшчаўся вялікі абраз нараджэння Маці Божай у пазалочанай раме (работы Менза), які перамяшчаўся і закрываўся абразомПератварэння Гасподня. Усе абразы былі напісаныя на палатне. Адзін з алтароў упрыгожвала драўляная фігура Хрыста разной работы невядомага майстра.

Акрамя плябаніі і званіцы, візітыўныя акты фіксуюць таксама наяўнасць пры касцёле шпіталя і прытулка для беднякоў. Гэты шпіталь-прытулак, або як яго называлі, багадзельня, размяшчаўся недалёка ад касцёла ў невялікім драўляным будынку. [ 1, 2]

Дасягнутая ў першай палове XIX ст. пазіцыя каталіцкага Касцёла на Беларусі і ў Трабах у прыватнасці, была найзначнейшаю за ўсю яго гісторыю.Так Трабскі каталіцкі прыход налічваў амаль чатыры з паловай тысячы вернікаў. Магчыма, яна захавалася б і надалей, калі б не наступствы паўстання 1863—1864 г. Паўстанне паўплывала на абвастрэнне расійскай палітыкі. Сітуацыя істотна змянілася: мясцовыя дваране-каталікі, якія ў большай ці меншай ступені мелі дачыненне да антырасійскіх выступленняў, хацелі даказаць сваю лаяльнасць да ўрада і пачалі пераходзіць у праваслаўе. Гэтыя пераходы ўрэшце набылі даволі шырокія маштабы і часта былі такія спекуляцыйныя, што адміністрацыя нават вымушаная была ўжыць некаторыя абмежавальныя меры ў гэтай галіне.

Тым не менш колькасць каталікоў з вышэйшых пластоў грамадства, якія прынялі праваслаўе ў гэты перыяд, даволі значная. Паводле некаторых даследаванняў, толькі на працягу аднаго года (1865—66) на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю з каталіцтва ў праваслаўе перайшло больш за 30 000 мясцовай шляхты.

Апрача пададзеных фактаў, пашырэнню і ўмацаванню пазіцый праваслаўя ў Паўночна-Заходнім краі спрыяла і тое, што царскі ўрад на розных умовах перадаваў ва ўласнасць памешчыкаў (былых вайскоўцаў) канфіскаваныя маёнткі ўдзельнікаў паўстання. Новыя ж гаспадары пры гэтым імкнуліся перавесці залежных ад іх сялян-каталікоў у праваслаўе.

У другой палове  XIX - пачатку XX ст. канфесіянальная сітуацыя ў Трабах, як і ва ўсёй Беларусі, стала дастаткова напружанай. Паміж праваслаўным і каталіцкім духавенствам ішла пастаянная барацьба за ўздзеянне на рэлігійнае і грамадскае жыццё.  Абодва бакі імкнуліся не толькі павялічыць колькасць сваіх прыхажан, але і праследавалі палітычныя мэты. Праваслаўная царква актыўна выступала за агульнарускае адзінства, а каталіцкі касцёл – за аднаўленне Рэчы Паспалітай. Складаныя ўзаемаадносіны праваслаўнага і каталіцкага кіруючых органаў аказвалі негатыўны ўплыў на ўзаемаадносіны веруючых у Трабах. Паміж местачкоўцамі часта ўзнікалі споры і канфлікты на рэлігійнай аснове. У асноўным яны ўзнікалі ў сувязі з пераходам з адной веры ў другую падчас заключэння шлюбаў, або хрышчэння дзяцей.

Змешаныя шлюбы, навогул, не былі частай з’явай. Іх не прымаў, як каталіцкі касцёл, так і праваслаўная царква. Акрамя таго, варожыя адносіны да такіх шлюбаў назіраліся і з боку родных і блізкіх. Не ўхваляліся такія markdown рознаверныя саюзы і  уладамі. Асабліва негатыўныя адносіны былі да шлюбаў рускіх чыноўнікаў з каталічкамі.

Дастаткова жорсткай па адносінах да змешаных шлюбаў была пазіцыя каталіцкага духавенства. Гэта выклікана існаваўшай да 1905 года забаронай пераходу з праваслаўя ў іншыя веравызнанні, у сувязі з чым, змешаныя шлюбы павінны былі здзяйсняцца толькі па праваслаўных абрадах, а дзяцей ад іх можна было хрысціць толькі ў царкве. Для каталіцкага духавенства гэта азначала страту часткі сваіх вернікаў. Таму святары па-ўсякаму пярэчылі гэтаму: або не давалі дазволу на такі шлюб, або самі тайна вянчалі католікаў з праваслаўнымі, ці хрысцілі дзяцей ад змешаных шлюбаў. Прабабуля Цэзарыя расказвала, што калі каталічка выходзіла замуж за праваслаўнага і брала шлюб у царкве, то па ёй у касцёле званілі званы, як па памерлай. А ў царкве ад яе патрабавалі, каб яна растаптала сваю каталіцкую кніжачку для набажэнстваў.

Зразумела, што лік католікаў у парафіі, хаця і нязначна, але знізіўся. На 1892 год  парафія налічвала  3986 католікаў.

У такі складаны час (вядома з візітыўных актаў 1851-1888 гадоў), будынак касцёла стаў ветхі. Колькасць парафіян налічвала амаль чатыры тысячы. А значыць узнікла патрэба пабудовы новага велічнага мураванага касцёла. Але ксёндз Павел Маркевіч, які працаваў святаром у Трабах, будаўніцтва новага касцёла так і не распачаў. У той час будаваць або рамантаваць касцёл святар мог толькі на ўласныя зберажэнні, збіраць грошы з прыхаджан строга забаранялася. [2]



Ксёндз Павел Сухоцкі

Будаўніцтва новага мураванага касцёла было распачата ў 1900 годзе. Яе фундатарам быў тагачасны трабскі святар - ксёндз Павел Сухоцкі. Касцёл вырашана было пабудаваць у неагатычным стылі. І не выпадкова. Да 1905 года, пакуль дзейнічаў указ імператара на забарону будаўніцтва каталіцкіх касцёлаў, стваральнікі новых храмаў імкнуліся зрабіць так, каб будынкі было складана перарабіць у святыню іншай канфесіі. Першы камень у падмурак новай святыні быў закладзены і асвечаны пробашчам касцёла 8 верасня 1900 года, у свята нараджэння Найсвяцейшай Марыі Панны. Адметна, што новы касцёл будаваўся па прынцыпу “матрошкі”. Сцены новага будынка ўзводзіліся абапал сцен старога драўлянага касцёла. І ўсе пяць год, пакуль будаваўся новы будынак, у старым касцёле адпраўляліся набажэнствы, маліліся вернікі. У будаўніцтве храма прымалі ўдзел як парафіяне, якіх к 1905 году налічвалася пяць тысяч, так і запрошаныя майстры.



Праект касцёла ў Трабах

Як сведчаць дакументы з архіва касцёла, 24 чэрвеня 1900 года было заключана пагадненне паміж святаром Трабскага касцёла Паўлам Сухоцкім і мешчанінам Пятроўскім Антонам Казіміравічам, аб згодзе апошняга вырабіць

цэглы на сваім полі, са сваёй гліны, выпаліць сваімі дрывамі і падрыхтаваць яе столькі, колькі будзе патрэбна для ўзвядзення касцёла. [ 2]

Як сведчыць пагадненне ад 28 чэрвеня 1900 года, узвядзеннем будынка Трабскага касцёла займаўся селянін Курляндскай губерніі Фрыдрыштадскага уезда Альтсаўкенскай воласці Андрэй Генрыхавіч Балладзь са сваімі рабочымі па праектах інжынера Краеўскага. [2 ]

Святар Павел Сухоцкі не дачакаўся ўрачыстага адкрыцця касцёла. Ён памёр у 1904 годзе. Згодна з дакументамі, заканчваў будаўніцтва святар Эдвард Дакурна. Менавіта ён заключыў пагадненне з мяйсцовым мешчанінам Сянкевічам Вікенціем Сямёнавічам аб укладцы цэментных пліт на падлогу касцёла, калідор, башні і прыступкі.

Усе будаўнічыя матэрыялы для касцёла былі закуплены ў лепшых тарговых дамах Вільні, Рыгі, Варшавы. Пастаўляў свой тавар завод Графа А.Тышкевіча, тарговы дом Братоў Холем, фабрыка цэментных вырабаў і дахавых толей І.Вальтэра, тарговы дом Ямонта, прадстаўніцтва капальняў мармуровых Кельцкіх. [ 2]

Закончылі будаўніцтва ў 1905 годзе. У тым жа годзе 23 кастрычніка была адпраўлена першая святая імша, адбылося асвячэнне святыні. А ў кастрычніку 1928 года архіепіскапам мітраполіі Віленскай Р.Ялбжыкоўскім адбылася кансэкрацыя касцёла [9]



Касцёл нараджэння Марыі ў Трабах

Даследуючы архівы касцёла, выявілася, што на момант адкрыцця новай святыні, парафія налічвала ўжо 5490 парафіян. Захоўваюцца ў архівах і цэлыя стосы Паведамленняў ад Віленскага Губернскага Праўлення аб пераходзе хрысціян з праваслаўя ў каталіцкую веру. Паведамленні значацца ад восені 1905 да 1913 года. Зацікавіўшыся такім масавым пераходам у каталіцтва, я даведалася, што 17 (29) красавіка 1905 г. у Расійскай імперыі быў прыняты

«Именной Высочайший Указ Правительствующему Сенату», вядомы пад назвай «Об укреплении начал веротерпимости». А ўрачыстае адкрыццё Трабскага касцёла Найсвяцейшай Марыі Панны адбылося ўжо пасля прыняцця ўказа. А значыць і павелічэнне колькасці парафіян не выпадковае. Прыняцце ўказа — гэта гуманны акт, які дазволіў кожнаму чалавеку прыняць веру сваіх бацькоў, а больш праўдзіва,— выбраць веру «як падказвае сэрца», а не толькі як склалася традыцыйна — веру бацькоў. Вядомы беларускі даследчык А. Грыцкевіч адзначае, што дадзены акт — гэта «ўступка расійскага царызму, зробленая на карысць каталіцкага Касцёла. Паводле ўказа 1905 года праваслаўныя маглі пераходзіць у каталіцтва без асабістых і цывільных наступстваў, католікам вярталіся зачыненыя касцёлы, вывучэнне рэлігіі ў школах дазвалялася весці на роднай мове вучняў, уніятам абвяшчалася амністыя, якую яны скарысталі, прымаючы лацінскі абрад». Толькі 18 жніўня 1905 г. былі выдадзены часовыя правілы МУС аб пераходзе з праваслаўнага веравызнання ў іншае хрысціянскае і вяртанні з праваслаўя ў нехрысціянскую веру. Аднак каталіцкія святары аж да 1908 г. прымалі вернікаў, кіруючыся распараджэннямі сваіх епіскапаў. У выніку атрымалася так, што адных і тых жа вернікаў і праваслаўная царква, і каталіцкая лічылі сваімі.

Але нават пасля прыняцця ўказа не менш складанай заставалася праблема міжканфесіянальных (змешаных) шлюбаў, якія былі дазволены Св. Сінодам яшчэ ў 1721 г. Але закон прадугледжваў, каб святое таінства шлюбу праваслаўных зхрысціянамі іншых канфесій адбывалася ў праваслаўных храмах і праваслаўнымі свяшчэннікамі. Указ ад 17красавіка (як і Маніфест ад 17 кастрычніка) 1905 г. захаваў перавагу праваслаўнай царквы і рэгулюючую ролю дзяржавы. Указ не ўводзіў новых правілаў для рэгулявання парадку заключэння рознаверных шлюбаў і вызначэння канфесіянальнай належнасці народжаных у іх дзяцей.

Пасля 1905 ва ўмовах адноснай лібералізацыі канфесійных адносін наступіла пэўнае ажыўленне ў дзейнасці Каталіцкага Касцёла ў Беларусі. Імкліва пачаў узрастаць беларускі нацыянальны рух, якому спрыяла і частка каталіцкага

святарства. Многія дзеячы беларускага нацыянальнага адраджэння напачатку ХХ стагоддзя былі каталікамі.

Зведалі муры Трабскага касцёла і святароў – асветнікаў, паэтаў і грамадскіх дзеячаў. **Аляксандр Астрамовіч**, каталіцкі святар заходняга абраду, які пачаў сваё душпастырскае служэнне ў ракаўскім касцёле ў 1911 годзе. У літаратурнай традыцыі  А. Астрамовіч вядомы пад псеўданімам Андрэй Зязюля. Нарадзіўся будучы святар і паэт 26 лістапада 1878 года ў сялянскай сям'і Сцяпана і Ганны Астрамовічаў у вёсцы Навасады Гальшанскай гміны Ашмянскага павета. Пасвечаны ў святары ў 1910 годзе. Душпастырскую дзейнасць пачаў вікарыем ракаўскага касцёла. А  сваю першую Імшу адправіў у вёсцы Трабы Валожынскага павета 2 лютага 1911 года. З 2 ліпеня 1912 года да лютага 1915 года служыў у парафіі Анопаль Мінскага дэканата. Пазней быў прызначаны вікарыем у Бабруйскую парафію. Са снежня 1916 года служыў вікарыем у Смілавічах Ігуменскага павета і ў суседніх касцёлах, выконваў абавязкі адміністратара гарадзішчанскага касцёла. З 9 верасня 1917 года — пробашч касцёла ў Абольцах Аршанскага дэканата. Два гады служыў ксяндзом у мястэчку Сянно Аршанскага дэканата. Там памёр 17 студзеня 1921 года, пахаваны на мясцовых каталіцкіх могілках.

Літаратурная творчасць і асветніцкая дзейнасць ксяндза А. Астрамовіча звязана з вытокамі беларускага каталіцкага адраджэння першай паловы ХХ ст. Лідэрам гэтага руху ў Заходняй Беларусі быў гісторык, публіцыст, тэолаг і філосаф ксёндз Адам Станкевіч. У манаграфіі «Родная мова ў святынях» ён пісаў: «У ХХ в. ужо спатыкаем сьведамых ксяндзоў беларусаў, верных сыноў Касьцёла і свайго народа, як Фр. Будзька, А. Астрамовіч, К.Стэповіч, З. Якуць, Ф. Абрантовіч, В. Гадлеўскі, В. Шутовіч, П. Татарыновіч, А. Сікора, Я. Рэшаць, І. Тарасэвіч і многа іншых»2. Польская каталіцкая адміністрацыя не давярала ксяндзу Астрамовічу і часта мяняла месцы яго службы. Але і гэтыя вандроўкі асветнік выкарыстаў дзеля таго, каб паслужыць Маці-Радзіме. У прадмове да пасмяротнага выдання выбраных твораў А. Зязюлі А. Станкевіч пісаў: «Усе тыя куткі Ашмяншчыны і Валожыншчыны, як Гальшаны, Трабы, Вішнёва, Баруны,

Крэва, дзе часта пабываў Зязюля, помняць яго і сяння. Нёс ён туды прамень праўды, святло беларускай народнай свядомасці як жывым словам, так і праз родную кніжку і газету [...]. Зязюля — гэта праўдзівы ідэаліст, гэта мучанік за родную ідэю»

**Леанард Чарняк** (1893–1976) – каталіцкі святар заходняга абраду, удзельнік беларускага хрысціянскага руху XX ст., душпастыр. Нарадзіўся 20 красавіка 1893 года у в. Дордзішкі Ашмянскага павета Віленскай губ.(непадалёк ад Трабаў). Паходзіў з беларускай сялянскай сям'і: бацькі – Міхал і Францішка Чарнякі. У чэрвені 1911 г. скончыў гарадское 4-класнае вучылішча ў Ашмянах. Вучыўся ў Віленскай духоўнай каталіцкай семінарыі (1912—1917). Пад час вучобы ў семінарыі ў дакументах называў сябе беларусам. Пасвячоны ў святары 26 мая 1918года. Душпастырскую дзейнасць распачаў на пасадзе вікарыя ў парафіі Эйшышкі Радунскага дэканата. З 1920 г. служыў пробашчам у Смаргоні. З пачатку 30-х гадоў— у парафіі Трабы Вілейскага дэканата (1933—1936). Прыхільнік Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. З беларускім нацыянальна-рэлігійным рухам звязаны з часоў вучобы ў Вільні. Матэрыяльна падтрымліваў выданне беларускай каталіцкай газеты «Krynica». Пасля Другой сусветнай вайны працаваў у парафіі Шчацінак Шчэцінскага дэканата. Памёр 11 чэрвеня 1976 года.

На 1939 год у БССР былі зачыненыя амаль усе каталіцкія касцёлы, а ў 10, што фармальна дзейнічалі, не было аніводнага святара. Была фізічна знішчана большасць каталіцкіх святароў. Згодна з тэрытарыяльным падзелам, Трабы засталіся ў складзе Польшчы. У Трабах Каталіцкі Касцёл знаходзіўся ў спрыяльных умовах і займаў прывілеяванае становішча. Канстытуцыі 1921 і 1935 гадоў прызнавалі роўнасць рэлігій і права на вольнае выкананне культаў, аднак польскі ўрад разглядаў Каталіцкі касцёл як аснову ў правядзенні сваёй палітыкі. Касцёл не быў аддзелены ад школы, і меў вялікі ўплыў на адукацыю. Трабы ўваходзілі ў Віленскую архідыяцэзію.

Пасля ўваходу Заходняй Беларусі ў склад БССР савецкае заканадаўства пра культы было пашырана на новыя тэрыторыі, уплыў Каталіцкай Царквы рэзка

скараціўся, ксяндзы і манахі падвяргаліся рэпрэсіям. Менавіта ў такі складаны час у Трабскі касцёл быў накіраваны працаваць ксёндз Вацлаў Родзька (1888-1940). Ён адпрацаваў пробашчам парафіі толькі з 1938 па 1940 год. Вучыўся ён у Віленскай духоўнай семінарыі. Пасля таго як прыняў капланства быў назначаны вікарыем у Гродна. У 1920 годзе працаваў пробашчам у парафіі Гальшаны, а з 1929 па 1938 год быў пробашчам парафіі Пятра і Паўла ў Старых Васілішках. У 1938 годзе ксёндз пераехаў у парафію Трабы. Вядома, што 22 мая 1940 года ноччу пробашча пазвалі да хворага, каб паспавядаць. Дадому ксёндз так і не вярнуўся - яго знайшлі забітым.

Каля ўвахода ў касцёл знаходзяцца магілы, а на сценах вісяць памятныя таблічкі, прысвечаныя ксяндзам-пакутнікам, якія загінулі ў час апошняй вайны.

Перыяд II сусветнай вайны быў вельмі цяжкім для святыні. У 1940 годзе бандыты закатавалі ксяндза Вацлава Радзько - пахаваны пры касцёле. Яго пераемніка, вікарыя Станіслава Зубковіча, расстралялі гітлераўцы ў 1941 годзе, ён пахаваны на прыкасцельных могілках. Побач з ім пахавана яго маці. Ксёндз Францішак Цыбульскі быў расстраляны немцамі як заложнік 10 сакавіка 1943 года і пахаваны на могілках ў Лідзе-Слабодцы. Ксяндза Пятра Аранскага забілі ў 1944 годзе, ён пахаваны ў Гальшанах.

Яшчэ адно важнае здарэнне звязана з мястэчкам Трабы. Першага ліпеня 1944 года салдаты з частак I, III, VI Батальёнаў, а таксама з III Ударнага Кадравага Батальёну 77 палка пяхоты Навагрудскай Акругі Арміі Краёвай, перамаглі немцаў у бітве за Трабы. А ў 1994 годзе, ў памяць аб загінуўшых, у Трабскім касцёле воінамі Арміі Краёвай ўстаноўлена памятная дошка.

Пасля вайны да 1966 года трабскім святаром быў ксёндз Альфонс Радкевіч. Ён як мог утрымліваў касцёл, а ўлады рабілі ўсё, каб яго выгнаць і ўрэшце ксёндз быў вымушаны з'ехаць у Польшчу. Да 1971 года Трабы не мелі сталага святара. І тым не менш касцёл працаваў дзякуючы парафіянам, якія яго абаранялі. На працягу трох год, з ініцыятывы жыхара Траб - Яцкевіча, парафіяне самі збіралі грошы і плацілі налогі, як за дзеючы касцёл. Хоць парафія засталася без ксяндза, то людзі самі маліліся ў святыні і адпраўлялі

набажэнствы без святара, спадзяючыся на лепшае і стараючыся атрымаць ад улады дазвол для святара. Таксама тыя ж ўлады забралі ключы ад касцёла, але гэта не прымусіла жыхароў Траб адрачыся ад веры. Парафіяне пачалі абыходзіць Крыжовую Дарогу вакол касцёла, прычым збіралася столькі людзей, што іх спеў чуўся аж за два кіламетры. Ноччу вернікі таксама не спалі: сцераглі касцёл ад разбурэння. З цягам часу дазвол быў выдадзены. Вернікі дабіліся таксама, каб прыязджалі ў касцёл ксяндзы з іншых мясцовасцей. У 1971-73 гадах у Трабы прыязджаў ксёндз Станіслаў Казлоўскі з Барунаў, затым да 1983 года ксёндз Уладыслаў Чарняўскі з Вішнева. Першым пастаянным святаром з часоў ксяндза Радкевіча стаў Антоній Юсель, які паходзіў з Трабскай парафіі. Зараз, з восені 2004 года, святаром там з'яўляецца ксёндз Віктар Субель, які паходзіць з Астраўца, што за Ашмянамі.

17 ліпеня 2005 года касцёл адзначыў сваё 100 – годдзе. На святкаванне быў запрошаны і годзенскі ардынарыюш біскуп Аляксандр Кашкевіч. Пасля прывітання пачалася святая імша ў памяць той, якая адбылася 100 гадоў таму першы раз у новым касцёле. Пад час святочнага багаслужэння ардынарыюш нагадаў аб […] першым хрыстусовым касцёле, які быў жывым касцёлам і азначаў супольнай верай і малітвай людзей, што вераць у Хрыстуса. І толькі пазней узнік касцёл як будынак, у якім збіраюцца людзі, каб аддаць хвалу Богу. Біскуп нагадаў, […] пра прыгожы каталіцкі звычай, які быў калісьці на гэтай зямлі, плод рэлігійнага жыцця. Калі ў мястэчку ці ваколіцы згараў дом, то збіралі ахвяры з усіх парафіянаў на новы будынак для пагарэльцаў. Паміж дамамі ў вёсках былі сцежкі, па якіх хадзілі людзі і наведвалі адзін аднаго. На жаль, сёння яны зарастаюць травой. Гэта ўсё паказвала знакі хрысціянскай любові. Побач з падзякай Богу за матэрыяльны касцёл, падзякуем таксама за жывы касцёл, які пераказалі Вам Вашыя продкі ў форме каталіцкай традыцыі, якая апіраецца на хрыстусовым евангеллі […].

## 2. *Касцёл Раства Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Трабах, як культурна-гістарычны помнік*

Вежы Трабскага касцёла заўважаеш здалёк, яшчэ за некалькі кіламетраў ад вёскі. Яна ўздымаюцца высока над кронамі дрэў, быццам спрабуюць дастаць да аблокаў . Проста перахоплівае дыханне. Безумоўна, касцёлы з вежамі выглядаюць больш велічна. Усё ж такі колькі метраў прыбаўляецца! Дарэчы, менавіта неагатычныя храмы лічацца ў Беларусі самымі вялікімі. Касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Марыі Панны - помнік архітэктуры неаготыкі. Неаготыка ўзнікла ў сярэдзіне XIX стагоддзя, і праявілася ў каталіцкім сакральным дойлідстве. Стваральнікі новых храмаў імкнуліся зрабіць так, каб будынкі было складана перарабіць у святыню іншай канфесіі. Асаблівасцямі неагатычных храмаў з'яўляюцца стральчатыя абрысы праёмаў, вокнаў і парталаў, востраканечныя франтоны і контрфорсы — падпорныя рытмічныя сценкі. [ 3, 4]



Суровая і магічная двухвежавая архітэктурная кампазіцыя створана на крыжападобным плане з пяцігранна апсідай і невялікім трансептам. Манументальнасць будынка падкрэслена і ўзмоцнена двухсхільным дахам з сігнатуркай над прэсбітэрыяй, чатырохграннымі шатрамі трох'ярусных вежаў. Асноўная ж архітэктурная сімфонія разыгрываецца на цагляных сценах будынка, рытмічна члянёных контрфорсамі ў прасценках стральчатых аконных праёмаў з гатычнымі кратамі. У дэкаратыўнай апрацоўцы выкарыстаны аркатурныя і філянговыя фрызы, пінаклі, "вісячыя палоткі", стральчатыя нішы.

Не менш захапляльнае і ўнутранае ўбранства касцёла. Бляск мармуровых дошак, мазаіка на падлозе. Высокія і шырокія грандыёзныя міжнефавыя аркады на выцягнутых у вышыню слупах, падзяляюць унутраную прастату храма на тры нефы, і гэта планіровачная структура вызначыла сіметрычна-

восевую трохчастковую кампазіцыю галоўнага фасада. Цэнтральны – перакрыты цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі, бакавыя — крыжовымі. Над уваходам — хоры, на якіх знаходзіцца арган з двума клавіятурамі і педалямі, з пнеўматычнай сістэмай (на жаль, не дзеючы). [ 3, 4]



Галоўны алтар касцёла



Унутраны воблік храма

Не толькі за кошт свабоды вышыні і прасторнасці, але і дзякуючы дэталізацыі расчлянёнасці архітэктурных элементаў унутраны воблік храма ўспрымаецца ў пастаяннай зменлівасці прасторавых куліс, у нястрымным руху да галоўнай святыні- алтара.

А тры пазалочаныя алтары, таксама выкананыя ў неагатычным стылі з'яўляюцца сапраўдным упрыгожваннем касцёла. У кожным алтары па 2 абразы. Галоўны алтар упрыгожвае абраз нараджэння Найсвяцейшай Марыі Панны ў пазалочанай раме. Алтар нібы імкнецца ў нябёсы. Яго стрэльчатыя абрысы дастаюць да малюнка на скляпенні.

На бакавым алтары размяшчаецца абраз Святога Антонія. Старэйшыя вернікі распавядаюць, што нібыта гэты святы выратаваў касцёл пад час артылерыйскага абстрэлу ў першыя дні вялікай Айчыннай вайны. Снарад трапіў у бакавую капліцу касцёла, прабіў дахавае пакрыцце і зваліўся не ўзарваўшыся на падлгу каля абраза св.Антонія, які вісеў проста на сцяне. Пасля вайны абраз быў перанесены ў бакавы алтар, а пазней упрыгожаны залацістым покрывам.

Абразы, якія сёння ўпрыгожваюць касцёл, былі напісаныя ў пачатку 19 ст. [3,4]

Асобным архітэктурным творам з’яўляецца разная амбона, якая ўзвышаецца над прасторай касцёла.

Вельмі прыгожыя абразы-стацыі, якія паказваюць усю крыжовую дарогу Хрыста. Выкананы ў выглядзе гіпсавай рэльефнай лепкі. Яны па кругу апаясваюць усю прастору касцёла.



Алтар св.Антонія

Рымска-Каталіцкая Царква шырока ажыццяўляе выдавецкую дзейнасць. Сёння ў Трабскім касцёле можна набыць і прачытаць наступныя каталіцкія перыядычныя выданні: часопісы «Наша вера» (ад 1995; Мінск), «Дыялог» (ад 1994; Баранавічы), «Ave Maria» (ад 1994; часопіс Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі), газеты «Слова Жыцця» (Гродна), «Голас Душы» (Мінск), «Любите друг друга» (Мінск). Штогод касцёлам ладзіцца пілігрымка ў санктуарый Маці Божай Тракельскай. Адыгравае каталіцкі касцёл і істотную ролю ў рэлігійным жыцці вёскі, з'яўляючыся большай па колькасці вернікаў канфесіяй у Трабах. Яна падтрымлівае канструктыўныя адносіны з праваслаўным прыходам Пятра і Паўла ў Трабах.

*Заключэнне:*

У пачатку свайго даследвання я меркавала, што даследуючы гістарычныя падзеі і палітыку дзяржавы на пераломных этапах гісторыі я змагу вызначыць, якія фактары паўплывалі як на станаўленне каталіцкага касцёлу ў Трабах, яго росквіт, так і на яго заняпад і наступнае адраджэнне. Вынікі даследвання пераўзышлі ўсе мае чаканні. Аказалася, што ўся гісторыя каталіцкага касцёла ў Трабах непарыўна звязана з гістарычнымі падзеямі не толькі маёй малой Радзімы, але і ўсёй краіны ў цэлым.

Я знайшла адказы на ўсе свае пытанні: у Трабах былі (верагодан) чатыры каталіцкія Храмы і кожны з іх валодаў сваёй функцыяй.

Першы храм, фундаваны княгіняй Марынай Трабскай насіў абарончы характар у межах замк, на памежжы ВКЛ. Другі – быў фундаваны Альбрэхтам Гаштольдам ў самы росквіт ВКЛ і нёс асветніцкі накірунак. Пры ім працавала свецкая школа. Трэці быў фундаваны Антоніем Радзімінскім Францкевічам у час падзелу Рэчы Паспалітай, у ім закладзены ідэі патрыятызму і магутнасці дзяржавы. Чацвёртая святыня будавалася ў час прыцяснення каталіцкага касцёла. Будынак быў пабудаваны велічны і магутны ў неагатычным стылі. Такія пабудовы былі характэрныя для таго часу, бо неагатычны касцёл немагчыма было перабудаваць у праваслаўны Храм. Зараз, калі Трабская парафія налічвае каля 900 вернікаў, касцёл здаецца непамерна вялікім, а ў пачатку XX стагодзя ён павінен быў змясціць больш шасці тысяч парафіян.

Але самыя трагічныя часы і часы забароны і заняпаду прыйшліся на Трабскі касцёл у сярэдзіне XX стагоддзя. Але дзякуючы намаганням святароў, якія тут працавалі, і парафіян, каталіцкі касцёл у Трабах адрадзіўся і пасля 100 – гадовага юбілею святыні прадаўжае свой росквіт

Гісторыя каталіцкага касцёла ў Трабах захоўвае яшчэ шмат таямніц і цікавых падзей, якія сведчаць і аб укладзе жыцця вёскі ў цэлым. Для мяне засталося яшчэ шмат невядомых старонак для даследвання. І я не спынюся на дасягнутым.

***Літаратура***


1. Акты инвентарных имений XVI столетия Виленской археографической комиссии. Вильна, 1887.
2. Архівы касцёла Найсвяцейшай Марыі Панны ў Трабах
3. Архітэктура Беларусі: энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 1993
4. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць.-Мн.,1986
5. Каталог архідыяцэзіі Віленскай для парафіян і духавенства. - Вільня, 1937
6. Летапіс Трабскай сярэдняй школы, 1966.
7. Покровский, Ф.В. Археологическая карта Виленской губернии. - Вильна, 1893.
8. Памяць: Гістарычна-дакументальная хроніка Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл. — БелТА. — Мн.: 2002.
9. Сінод архідыяцэзіі Віленскай. – Афіцыйная архідыяцэзіальная тыпаграфія. – Вільна: 1932 г., 573 с.
10. SŁovnik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów sŁowiańskich.T.3. – Warszawa,1882
11. Stryjkowski,M. Kronika polska, litowska, zmodzka i wszyskiej Rusi. Warszawa, 1846.
12. SŁovnik geograficzny…t.12. – Warszawa,1891

Дадаткі

Фотаздымкі Трабскага касцёла:












